**Г. В. Пісарэвіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі

# Урок беларускай мовы ў 9 класе

**Тэма:** Паняцце пра складаназалежны сказ

**Мэты:**

- садзейнічаць асэнсаванню вучнямі сэнсава-граматычных адносін паміж часткамі складаназалежнага сказа;
- удасканальваць уменні адрозніваць складаназалежныя сказы ад складаназлучаных, знаходзіць іх у тэкстах;
- садзейнічаць выхаванню пачуцця асабістай годнасці, адказных паводзін.

**Абсталяванне:** табліца «Складаназалежныя сказы», тэставыя заданні № 1, 2.

**Эпіграф:** «Словам мы адкрываем прыгажосць прыроды і душы чалавека».

В. Вітка

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап**

**Мэта:** псіхалагічная падрыхтоўка класа да ўрока, арганізацыя ўвагі вучняў.

**Педагагічная задача:** арганізаваць і падтрыхтаваць вучняў да работы, стварыць атмасферу ўзаемадапамогі і супрацоўніцтва.

Педагог вітаецца, жадае поспехаў, праводзіць гутарку па змесце эпіграфа.

**II. Арфаграфічная хвілінка**

*Папераджальны дыктант*

Ін’екцыя, булён, цьма, дзьму, вазьму, каменьчык, агеньчык, вагончык, сядзьце, будзьце, хатынскі, восеньскі, жнівеньскі, подзвіг, ледзьве, мядзведзь, Іўе, меншавік, аб’ява, прыслоўе.

**III. Арыенціровачна-матывацыйны этап**

**Мэта:** актывізацыя суб’ектнага вопыту вучняў, фарміраванне пазнавальнага інтарэсу, самавызначэнне вучняў на вынік урока.

**Педагагічная задача:** актуалізаваць апорныя веды і ўменні вучняў, сфарміраваць пазнавальныя матывы, стварыць умовы для самавызначэння вучняў на дзейнасць і яе вынікі.

Вызначэнне тэмы і мэты ўрока праз праблемную сітуацыю.

| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| Настаўнік прапануе вучням разгледзець табліцу «Асноўныя віды складаных сказаў» (гл. Дадатак 1) і адказаць на пытанні:<br>✓ Які сказ называецца складаным?<br>✓ Якія ёсць віды складаных сказаў?<br>✓ Якія складаныя сказы мы ўжо вывучылі? | Вучні разглядаюць табліцу і адказваюць на пытанні. |
| Настаўнік прапануе вучням выканаць невялікі тэст (гл. Дадатак 2), а затым | Вучні выконваюць тэст, самаправерку і каменціруюць выбар |

| | |
|---|---|
| праверыць сябе ( настаўнік паказвае правільныя адказы, запісаныя на адваротным баку дошкі) і пракаменціраваць .<br><br>Настаўнік задае пытанні класу:<br>✓ Якія сказы засталіся вамі не выбранымі?<br>✓ Чаму?<br>Настаўнік акрэслівае тэму ўрока, прапануе вучням вызначыць мэту ўрока. | адказаў.<br><br><br><br><br>Вучні адказваюць на пытанні.<br><br><br><br>Вучні фармулююць мэту ўрока. |

**IV. Аперацыйна-пазнавальны этап**

**Мэта:** усведамленне вучнямі асноўнага зместу вучэбнага матэрыялу, які вывучаецца на ўроку, пазнавальная актыўнасць вучняў.

**Педагагічная задача:** арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў па тэме ўрока.

| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| Прапаную вучням разгледзець і прааналізаваць табліцу «Складаназалежныя сказы» (гл. табліцу на форзацы падручніка).<br>Адказаць на пытанні:<br>✓ Чым складаназалежныя сказы адрозніваюцца ад складаназлучаных?<br>✓ Ці раўнапраўныя часткі ў складаназалежных сказах?<br>✓ З якіх частак складаюцца такія сказы?<br>✓ Якім відам сувязі звязваюцца? | Вучні аналізуюць табліцу і адказваюць на пытанні. |
| Настаўнік падагульняе сказанае, прапануе прачытаць параграф 13, старонка 77–78 і скласці план параграфа. | Вучні працуюць самастойна, пасля агучваюць свой план. |
| Даю заданне выканаць у парах практыкаванне 66, выпісаць складаназалежныя сказы, знайсці галоўную і даданую часткі, звярнуць увагу на знакі прыпынку.<br>Настаўнік слухае, уносіць карэктывы. | Выконваюць заданне ў парах і адказваюць. |

| | |
|---|---|
| Настаўнік прапануе папрацаваць у малых групах і выканаць практыкаванне 67. Кожнай групе даецца па аднаму сказу. З дапамогай табліцы на форзацы падручніка вызначыць сэнсавыя адносіны і сродкі сінтаксічнай сувязі паміж граматычнымі часткамі сказаў.<br><br>Праверка выкананага задання калектыўна з дадатковым тлумачэннем, як адрозніць злучнік ад злучальнага слова | Вучні працуюць у малых групах: запісваюць сказ, падкрэсліваюць граматычныя асновы, вызначаюць граматычныя часткі, будуюць схему, вызначаюць сродак сінтаксічнай сувязі частак.<br><br>Вучні чытаюць сказы, тлумачаць, працуюць з табліцай на форзацы падручніка. Робяць вывад, як адрозніць злучнік ад злучальнага слова. |

**V. Кантрольна-карэкцыйны этап**

**Мэта:** высвятленне ўзроўню засваення новага матэрыялу праз выкананне праверачнага тэста.

**Педагагічная задача:** стварыць умовы для самакантролю, карэкцыі і самаацэнкі ведаў.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| Прапаную выканаць тэст (гл. Дадатак 3) і зверыць свае адказы з правільнымі. | Выконваюць тэст, правяраюць і ацэньваюць сваю работу. |

**VI. Рэфлексія**

**Мэта:** усведамленне значнасці вучэбнай дзейнасці і сітуацыя поспеху.

**Педагагічная задача:** стварыць умовы для самаацэнкі дзейнасці вучняў і ўсведамленне імі асобасных сэнсаў у вывучэнні тэмы.

| **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** |
|---|---|
| Прапаную працягнуць выразы (метад «Працягні фразу»):<br>1. Сёння на ўроку я даведаўся…<br>2. Мне яшчэ трэба папрацаваць над…<br>3. Я думаю, разабрацца ў гэтым пытанні мне дапаможа… (падручнік, сябар, настаўнік, табліца) | Ацэньваюць сваю дзейнасць, акрэсліваюць цяжкасці, якія ўзніклі ў ходзе работы на ўроку. |

**VII. Дамашняе заданне**

| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| Запісваю дамашняе заданне на дошцы: § 13, пр. 68. Прапаную паглядзець і задаць пытанні, калі штосьці выклікае цяжкасці. | Чытаюць умову практыкавання і задаюць пытанні. Запісваюць заданні ў дзённік. |

**Ключавое пытанне:** Ці трэба сучаснаму маладому чалавеку ў наш імклівы час ужываць у сваім маўленні складаназалежныя сказы? Чаму?

## <u>Дадаткі да ўрока</u>

**Дадатак 1**

### Асноўныя віды складаных сказаў




**Дадатак 2**

### Тэставае заданне № 1

*Выпісаць нумары складаназлучаных сказаў.*

1. На календары ўжо даўно была зіма, аднак снегу яшчэ не было.
2. Люблю на беразе азёрным у ціхі вечар пастаяць, калі ў ваду з нябёсаў зоркі блакітнавокія глядзяць.
3. Пад раніцу згаслі зоры на небе і месяц за беражок лесу закаціўся.
4. Лівень, які абмыў нябёсы і зямлю, закончыўся гэтак жа раптоўна, як і пачаўся.
5. Звіняць вясновыя капяжы і мільгаюць, коцяцца з пагорка ўніз вясёлыя ручаіны.

**Дадатак 3**

### Тэставае заданне № 2

1. Выпішыце неабходны варыянт.
   У складаназалежным сказе часткі звязваюцца:
   А) злучальнай сувяззю;
   Б) падпарадкавальнай сувяззю;
   В) бяззлучнікавай сувяззю.
2. Выпішыце нумары складаназалежных сказаў:
   А) Любоў да Радзімы ў чалавека яскрава праяўляецца тады, калі ён на час разлучыцца з ёю.
   Б) Першы веснавы дождж, відаць, нядаўна змыў старую іглiцу, і ёлкі то тут, то там зелянелі чыста.

В) Багуны скончыліся, але іх гаркаваты водар яшчэ кружыў галаву, ёлка сушыў у горле.

Г) Ёсць нейкія заваблівыя чары, паэзія і хараство ў гэтых дарогах-ручаях, што пракладаюць пуціны вясне і адноўленаму жыццю на зямлі.

3. Выпішыце складаназалежны сказ, будова якога адпавядае схеме [… ,(што… ),… ]:

   А) Калі многа снегу, многа, кажуць, будзе хлеба.

   Б) На вузенькіх сцежках, што промнямі ляглі вакол мурашніка, кіпела работа.

   В) Калі ёсць жаданне, з’явіцца ўменне.

4. Выберыце схему, якой адпавядае сказ:

   А) [… ], (як … )

   Б) (Калі … ), [… ]

   В) [… ,(дзе … ), …]

   У небе бяздонным, дзе хмаркі купаюцца, вольныя песні штодзень разліваюцца.

**Адказы для самаправеркі**

1.Б

2.А, Г

3.Б

4.В